Згода

Палітыка

N 32 (168) • 4 ЛІСТАПАДА 2000Г.

РАЗВАЖАНЬНІ

НАЦЫЯ ЯНЫЧАРАЎ

Аляксандар Кавальскі

Калісьці ў першую суботу лістапада беларусы адзначалі Дзяды. Праз штогадовы рытуал яны аднаўлялі сваю повязь ня толькі з уласнымі продкамі, але й з агульным мінулым. Пачцівасьць да продкаў і павага да сваёй гісторыі — якасьці, якіх вельмі бракуе сучасным жыхарам Беларусі.



МІНУЛАЕ НА МІКРАЎЗРОЎНІ

Банальна, але праўда: мала хто з нас можа прасачыць свой радавод хаця б да прадзедаў. Маюцца на ўвазе не фрагмэнтарныя зьвесткі, не сямейныя выдумкі-паданьні, а канкрэтная праўдзівая інфармацыя. Таксама ў нашай краіне амаль адсутнічае такая распаўсюджаная ва ўсім сьвеце зьява, як сямейныя архівы. Вось латышы прынялі закон аб вяртаньні маёмасьці, адабранай камуністамі, законным спадкаемцам. І што вы думаеце, знайшліся й спадкаемцы, і дакуманты, што пацьвярджаюць іхныя правы. Альбо ўзяць французаў. Нарэшце Расея пагадзілася выплаціць частку даўгоў па царскіх яшчэ пазыках. Дык у Францыі адразу знайшліся тысячы ўладальнікаў царскіх дарэвалюцыйных аблігацыяў і іншых каштоўных папераў. А дзе ўсё тое, што нашыя продкі — дзядулі й бабулі — захоўвалі ў сваіх куфрах? Адзін такі стаяў і ў хаце маіх дзеда з бабкай. Спасылкі на шматлікія войны тут недарэчныя, бо не адны беларусы пакутавалі ад іх, а фактычна палова Эўропы.

На фоне нашай абыякавасьці да свайго паходжаньня выключэньнем выглядае тэстамант Антонія Радзівіла, грамадзяніна Вялікай Брытаніі, дзе ён просіць пахаваць яго ў фамільным склепе ў нясьвіскім касьцёле. Чалавек, які нават ня памятаў Беларусі, усё жыцьцё якога прайшло за яе межамі, жыва адчуваў свае карані.

МІНУЛАЕ НА МАКРАЎЗРОЎНІ

На ўзроўні сьвядомасьці народу, гістарычнай памяці беларусаў як этнасу таксама нічога аптымістычнага не назіраецца. Гістарычны час некалькі разоў гвалтоўна скажаўся. Самая апошняя ягоная абэрацыя была й самай моцнай, пачаўшыся з прыходам камуністаў. Яны асэнсавана адмовіліся ад гістарычнага кантынуітэту, пераемнасьці, расьсекшы гістарычны час на той, што да рэвалюцыі (ня варты ўвагі), і пасьля. Па сваёй маштабнасьці й наступствах гэты крок параўнальны хіба са зьменай антычнага цыклічнага ўспрыманьня часу хрысьціянскім, дзе вехай, ад якой усё бярэ пачатак, стала нараджэньне Езуса.

Як сярэднявечны храніст зь ідэалягічных меркаваньняў упісваў сучасныя яму падзеі ва ўнівэрсальную біблейскую канву, так і камуністычныя летапісцы ўсе падзеі мінулага зьмяшчалі ў кантэкст сваёй новай рэчаіснасьці. У савецкія часы мы ўсе вучыліся па падручніках з абсурднай назвай «*Гісторыя СССР ад старажытных часоў да...*», але амаль ніхто ня бачыў гэтай абсурднасьці, не задаваў пытаньне, якое-такое «*СССР*» было ў старажытнасьці. Жыхары каралеўства крывых люстэркаў не зважалі на такія дробязі.

Як гэта ня прыкра, але Лукашэнка сапраўды зьяўляецца тыповым беларусам, з уласьцівым для нас скажоным разуменьнем уласнае гісторыі. А гістарычная адукацыя, атрыманая прэзыдэнтам у Магілёўскім пэдуне, толькі

Заканчэньне на с. 2

КОЛОНКА РЕДАКТОРА

КУРОПАТЫ: СИМВОЛ И БОЛЬ

Алексей Король

Двенадцать лет назад археолог и лидер новой волны белорусского возрождения Зенон Пазьняк вместе с коллегами открыл Куропаты как место массовых расстрелов жертв сталинского режима. Неведомое никому урочище под Минском стало известным всей Беларуси, а затем и всему миру. Оно превратилось в символ советского тоталитаризма и в знак беды, пережитой белорусским народом, народами других стран, побывавших под железной пятой тоталитарных режимов.

Куропаты, Катынь, Бухенвальд, Освенцим... Именно в таком порядке. Сталинская модель тоталитарной системы предшествовала гитлеровской, послужив во многом образцом для подражания. Два режима сошлись в смертельной схватке за мировое господство. В пропагандистской войне они проговаривали порой правду о злодеяниях друг друга. Куропаты и здесь своего рода знак. Это название мы обнаружим в оккупационных газетах.

Куропаты — это 1937 год. Год построения в СССР социализма в основном, что в переводе с советского новояза означало: в основном была построена тоталитарная система. Для завершения жуткой стройки, придания всей конструкции прочности требовалось тотальное уничтожение всех явных и тайных врагов, всех сомневающихся и способных понять. Требовалось тотальное устрашение всего общества. И пришел кровавый 1937 год. 29 октября в куропатском лесу весь день звучали пистолетные выстрелы. И на следующий, и на следующий, следующий... за годом год. 250 тысяч. Белорусская интеллигенция, священники, рабочие, крестьяне... Цвет нации. Белорусы, евреи, русские, поляки... Интернационал и социальное братство на краю братской могилы.

1937 год — не начало и не конец смертоносной вакханалии тоталитарной диктатуры. Истоки ее в1917, в революции. Конец ее в полной правде о совершенных ею злодеяниях, в замене ее полноценной демократией. Куропаты и здесь символ, предупреждение о новой беде. Но и символ сопротивления тоталитаризму. Правдой о Куропатах начиналась борьба за демократию в Беларуси. Сокрытием правды, силовым разгоном и запретом шествий к священным могилам начиналась и длится новая диктатура. Вновь упрятаны под замок архивы НКВД, вновь мракобесы от науки пытаются оправдать репрессии, вновь преследуются ученые, которые стремятся эту правду раскрыть.

Маскирующаяся диктатура боится разоблачающих сравнений с прошлым. Мягкая диктатура стремится стать железной диктатурой. Трагедия Куропат и сотен других пока неизвестных нам поименно трагедий, голоса тысяч погибших взывают к нам из прошлого, побуждая к активной борьбе с доставшейся на нашу долю диктатурой. Предупреждают: нельзя отсиживаться в тиши, нельзя приспосабливаться, нельзя торговаться с диктатором. Обманет, обманув — уничтожит. Рано или поздно режим достанет каждого. Спасение и победа — в объединении и сопротивлении. ■

СЕМ ДЗЁН

ГУЛЬНІ ДЫКТАТАРА

Антон Ляўковіч

Дзяржаўная кампанія пад назваю «Выбары–2000» скончылася як і варта было чакаць. На першы погляд уражвае лічба яўкі выбаршчыкаў у другім туры галасаваньня — 52,6 адсотка. Бо ж паводле ўсіх законаў сацыялёгіі вядома, што ў другім туры актыўнасьць электарату значна зьніжаецца ў параўнаньні зь першым. Беларуская рэчаіснасьць гэтыя законы абвергла.

На гэты раз улады, зрабіўшы адпаведныя высновы з вынікаў першага туру, 29 кастрычніка на поўную моц выкарысталі свой адміністратыўны рэсурс. Узгадаць хаця б дырэктыву галоўнага берасьцейскага вертыкальшчыка В. Даўгалёва, разасланую напярэдадні другога туру ўсім чыноўнікам вобласьці. У ёй Даўгалёў патрабаваў ад сваіх падначаленых выкарыстаць усе магчымасьці, але каб яўка выбаршчыкаў на ўчастку была высокай. Ды зрэшты, што гаварыць пра Даўгалёва ці яшчэ якога чыноўніка, калі сам Аляксандар Лукашэнка на нядаўняй нарадзе патрабаваў ад іх высокай яўкі 29-га, а дзяржаўным мэдыям загадаў весьці прапаганду *такім чынам, каб пераканаць людзей* прыйсьці прагаласаваць.

Тое, што ўлады й надалей будуць праводзіць ня выбары, а толькі пародыю на іх, было відавочна даўно. Пытаньне ў іншым, як пазьбегнуць гэтага фарсу на прэзыдэнцкіх выбарах. Пакуль адказу на яго ня маюць ні прадстаўнікі аб'яднанай апазыцыі, што зьбіраюцца перамагчы на наступных выбарах, ні сябры Цэнтральнай камісіі... дынацыйнай рады ў справе назіраньня за выбарамі, ні незалежныя назіральнікі, якія на свае вочы пераканаліся як дзейнічае адміністратыўны рэсурс.

Аднак не аднымі выбарамі жыла краіна гэты тыдзень. У той самы дзень, калі частка грамадзянаў Беларусі прымусова ці дабраахвотна ішла на выбарчыя ўчасткі, іншая, няхай сабе й меншая, накіравалася ў лясное ўрочышча Курапаты. У гэтым злавесным месцы, дзе 60 гадоў таму гучалі энкавэдыскія стрэлы ў патыліцу бязьвінных ахвяраў у нядзелю, менчукі й жыхары іншых гарадоў краіны паставілі 30 драўляных крыжоў над магіламі замардаваных суайчыньнікаў.

Простыя людзі вырашылі зрабіць тое, чаго на працягу больш 10 гадоў не зрабілі савецкая і постсавецкія ўлады — пабудаваць у Курапатах народны мэмарыял. Ад цяперашняй улады дачакацца гэтага немагчыма, што ўскосна пацьвердзіў генэральны пракурор Алег Бажэлка. Паводле яго, следчыя нібыта ня здолелі ўстанавіць, хто праводзіў растрэлы ў Курапатах. Пры гэтым Бажэлка дадаў, што, па выніках расьледваньня, у курапацкіх рвах ляжыць ня 250, а толькі 7 тысячаў чалавек. Гэтая ўлада праўды пра Курапаты ня скажа, бо адчувае сябе спадкаемцай сталінскай дыктатуры.

Аб тым, што ў цяперашняй Беларусі ўлады кіруюць сталінскімі мэтадамі, гаварылі многія ўплывовыя ўсясьветныя выданьні. Так, *New York Times* апублікавала на гэтым тыдні рэдакцыйны артыкул пад красамоўнай назваю «*Апошні тыран Эўропы*». У ім, у прыватнасьці, адзначаецца, што пасьля падзеньня рэжыму Мілошавіча ў Эўропе засталася адна краіна з дыктатарскім рэжымам — гэта Беларусь, якой кіруе калхозны папуліст і прыхільнік Гітлера Аляксандар Лукашэнка. Робіцца выснова, што цывілізаваны сьвет павінен цяпер дапамагчы Беларусі, як ён дапамагаў Югаславіі. Падобныя ж высновы робіць у сваім артыкуле пра Беларусь і нямецкая *Berlinske Tidende*.

Тое, што Лукашэнка становіцца небясьпечным дыктатарам, для цывілізаванага сьвету ўсё больш відавочна. Пра гэта сьведчаць і ягоныя зьнешнепалітычныя кантакты, у прыватнасьці, візыт да лівійскага правадыра Кадафі, якога аб'явіла ў вышук пракуратура Францыі. Захад абвясьціў Лукашэнку апошнім эўрапейскім дыктатарам і гатовы актыўна дапамагаць ягоным праціўнікам. Ці будзе такая тактыка плённай, пакажа бліжэйшы час. ■

СКОРО БУДЕТ ПО-НОВОМУ

ЗГОДА

**ДОРОГИЕ ЧИТАТЕЛИ!
ПРОДОЛЖАЕТСЯ ПОДПИСКА
НА ЕЖЕНЕДЕЛЬНУЮ ГАЗЕТУ «ЗГОДА»
СТОИМОСТЬ ПОДПИСКИ
НА МЕСЯЦ — 253 РУБЛЯ
ПОДПИСНОЙ ИНДЕКС 63138**

АНЕКДОТ-С

Иностранные наблюдатели на белорусских выборах:

— Хорошо, хорошо, очень хорошо!

— Чего здесь хорошего?

— Хорошо, что у нас такого не бывает.

***

— Наш президент напоминает мне океан.

— Ты хочешь сказать, что он великий и могучий?

— Нет, меня от него постоянно тошнит.

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ



АЖИОТАЖ

«Сегодня в Ливию стремятся прибыть руководители многих государств»

(А. Лукашенко, *«Навіны»*, 31.10.00)



СТРАНА ИНВАЛИДОВ

«Предлагаю всех, кто отказался от выборов, отнести к политическим инвалидам»

(Ю. Козиятко, *«Панарама»*, 28.10.00)



МАТРИАРХАТ

«Очень отрадно, что у нас пополняется женская коалиция»

(Л. Ермошина, *«Навіны»*, 30.10.00)

НАВІНЫ

РАДАР. Скончыліся папярэднія выпрабаванні стратэгічнага аб'екта войскаў ракетна-паветранай абароны Расіі, што месціцца пад Баранавічамі. Як выказаўся старшыня ракетных войскаў стратэгічнага прызначэння РФ Уладзімір Якаўлеў, пастаноўка радара на баявое дзяжурства будзе залежыць ад фінансавання. Шмат якія працы на аб'екце выконваліся беларускімі і расійскімі прадпрыемствамі ў доўг. Новая радыёлакацыйная станцыя будзе сачыць за касмічнаю прастораю ў межах сістэмы папярэджання ракетнага нападу на Расію і краіны СНД. Аб'ект здольны адсочваць балістычныя ракеты над усёй тэрыторыяй Еўропы і паўночнай Атлантыкі.

КОШТЫ. За першыя тры тыдні кастрычніка рост спажывецкіх коштаў у Беларусі склаў 3,5 %. Такія звесткі падало Міністэрства статыстыкі і аналізу. За першыя тры тыдні верасня кошты ўзраслі на 5,1 %. З пачатку 2000 года кошты ў Беларусі павысіліся на 84,3 % (за гэты ж перыяд 1999 года — у 2,5 разы).

ГРАНАТА. Раніцаю 30 кастрычніка міліцыя ачапіла вуліцу Працоўную ў самым цэнтры Гомелю. Прычынаю таму стаўся званок невядомага мужчыны ў міліцыю з паведамленнем, што ён знайшоў гранату ў скрыні для смецця, што стаіць на вуліцы. Як высветлілася пазней, гэта была граната Ф-1, прычым з выцягнутым кольцам. Усе сумненні рассеяў прыезд вайсковых спецыялістаў-мінёраў. Яны вызначылі, што граната была вучэбнаю. Тым не менш, супрацоўнікі міліцыі не лічаць, што праявілі залішнюю пільнасць.

ПАХАВАННЕ. 31 кастрычніка на беларускіх могілках Іст Брансўік у амерыканскім штаце Нью-Джэрсі адбылося пахаванне вядомага на эміграцыі беларускага дзеяча Васіля Русака. Ён памёр раніцаю 29 кастрычніка. Ён паходзіў з-пад Баранавічаў. У 1944 годзе мусіў падацца на чужыну. Вучыўся ва універсітэце ў Нямеччыне. Менавіта там выявіў сябе актыўным у руху беларускай акадэмічнай моладзі. Эміграваўшы ў ЗША, дзейна ўлучыўся ў жыццё мясцовай беларускай дыяспары: узначальваў беларускую школу ў Нью-Джэрсі, уваходзіў ва ўправу Нью-Брансўіцкага аддзела Беларуска-амерыканскага задзіночання.

ПІКЕТ. Сябры грамадскага аб'яднання «Няміга–99», што абараняе інтарэсы бацькоў, чые дзеці загінулі ў падземным пераходзе станцыі метро, 4 лістапада ладзяць 9-гадзіннае пікетаванне. Яно пройдзе з 12.00 да 21.00 за 200 метраў ад месца трагедыі — ля будынка спартовага комплексу. Мэта пікету — прыцягнуць увагу грамадскасці да пытання ўвекавечання памяці загінулых. Пікет санкцыяваны ўладамі.

ПРАТЭСТ. 30 кастрычніка студэнты Беларускай акадэміі мастацтваў правялі несанкцыянаваную акцыю пратэсту пад назваю *«Студэнт. Мастак. Жабрак»*. Навучэнцы факультэта станкавай графікі, якія страцілі надзею на годныя ўмовы навучання і жыцця, выйшлі на ганак навучальнай установы з плакатамі: *«Не дайце знікнуць культуры — забяспечце нас матэрыяламі»*, *«Без культуры няма будучыні»*, *«Не дайце знікнуць беларускаму мастацтву»*. Студэнты патрабуюць забяспечыць іх інструментамі і матэрыяламі, правесці элементарны рамонт майстэрняў, адкрыць майстэрню шаўкаграфіі. Акцыя выклікала цікавасць і ў мінакоў і ў працаўнікоў міліцыі.



Фота Ю. Дзядынкіна

ПРЫСУД. Вярхоўны суд адмяніў прысуд Берасцейскага абласнога суда былому дыякану Свята-Мікалаеўскай царквы Г. Калеснікаву, асуджанаму да 20 гадоў пазбаўлення волі, і накіраваў справу на даследаванне. Калеснікаў быў абвінавачаны ў забойстве настаяцеля гэтай жа царквы Міхаіла Спасюка. Вярхоўны суд палічыў, што няма прамых доказаў віны Калеснікава. Рэспубліканская пракуратура мае намер вынесці наконт гэтага пратэст.

ГЕПАТЫТ. На Гарадзеншчыне зарэгістраваная ўспышка віруснага гепатыту А. Узровень захворвання на гепатыт у вобласці павялічыўся сёлета ўтрая. Што да Мастоўшчыны, то ў шэрагу школаў там абвешчаны карантын, робяцца захады прадухіліць эпідэмію.

ПАМЕЖЖА. 30–31 кастрычніка ў Вільні прайшла сустрэча старшыні Дзяржкамітэта памежных войскаў Беларусі Аляксандра Паўлоўскага з галоўным камісарам памежнай паліцыі пры МУС Літвы Альгімантасам Сангайлам. Кіраўнікі памежных службаў падрыхтавалі да падпісання міжурадавыя пагадненні аб спрошчаным пераходзе дзяржаўнай мяжы памежным насельніцтвам і аб пунктах пропуску праз дзяржаўную мяжу. Шараметам там больш не месца!

ЭКСПАРТ. Дзяржаўны канцэрн Белэнерга і РАТ «Адзіныя энергасістэмы Расіі» рыхтуюць сумесны загад аб супольным развіцці энергетычных сістэм абедзвюх краін. Змест дакумента прысвечаны сумеснаму экспарту беларускай і расійскай электраэнергіі праз Польшчу ў Заходнюю Еўропу. Пакупнік энергіі знаходзіцца ў Нямеччыне, але застаюцца нявырашанымі пытанні транзіту праз Польшчу. Рэалізацыя праекта прызначаная на пачатак 2001 года.

МОЛАДЗЬ


ДОБРА ЗАБЫТЫЯ СТАРЫЯ

Ізя Кацман

Не паспеўшы зарэгістравацца, «Маладзёжная салідарнасць» пачала актыўную дзейнасць. Зараз яна ўваходзіць у кааліцыю «Пераменаў», якая, дарэчы, ужо 12 лістапада ладзіць палітычную акцыю. «Маладзёжная салідарнасць» мае сур'ёзныя намеры застацца ў беларускім коле дэмакратычных маладзёжных арганізацый, незалежна ад рэакцыі на іх заяву ў Мінюсце Беларусі.



Фота А. Сдвіжкова



Што ж такое «Маладзёжная салідарнасць»? Па словах лідэра і аднаго з заснавальнікаў — небезвядомага ў палітычных колах Цімоха Дранчука, МС гэта: *«Плануемае аб'яднанне вучнёўскай моладзі і студэнтаў. У асноўным «Салідарнасць» стваралася тымі, хто актыўна ўдзельнічаў у працы вядомых беларускіх маладзёжных арганізацый, але па розных прычынах расчараваўся ў іх дзейнасці. Пасіўна недзе сядзець і нічым не займацца такія людзі не могуць па стану душы, таму і стварылі арганізацыю, асноўнай справаю якой будзе абарона моладзі і дапамога ёй у самарэалізацыі.*

Вельмі хацелася б, каб нашая дапамога студэнтам адрознівалася ад таго, што можа прапанаваць, прыкладам, ЗБС. Яны могуць зрабіць адзінае — студэнт, які ў нас пацярпеў па палітычных матывах, можа з'ехаць на навучанне за мяжу. Адкуль, на жаль, многія проста не вернуцца. Мы ж павінны дапамагчы актыўнай моладзі застацца ў нашай краіне, рэалізавацца тут. Зараз да 70 адсоткаў моладзі жадае з'ехаць за мяжу, у асноўным на Захад, — назаўсёды».

Сапраўды, сярод стваральнікаў МС асобы вядомыя. Гэта былы старшыня Маладой грамады Сяргей Марцэлеў, сам Цімох Дранчук — былы сябра кіраўніцтва Маладога фронту, Мікола Прыварнікаў, шмат грамадскіх лідэраў з рэгіёнаў. Людзі, якія прайшлі сур'ёзную школу дэмакратычных маладзёжных арганізацый. Пры такім складзе вельмі мала спадзяванняў, што яны застануцца ў адной сваёй нішы.

Той жа Цімох Дранчук кажа: *«Маладзёжная салідарнасць» павінна стаць каталізатарам актыўнасці самога студэнцтва, балазе, накірункаў дзейнасці ў нас дастаткова. Гэта як палітычная дзейнасць, прапаганда сярод моладзі дэмакратычных каштоўнасцяў, так і дзейнасць у экалагічным, культурным кірунках... Нават ёсць у статуце пункт аб барацьбе з распаўсюджваннем дэструктыўных сект і таталітарных ідэалогій. Ізноў жа — размеркаванне, студэнцкае самакіраванне, іншая справа, што вынікаў у гэтай галіне дзейнасці няма ні ў каго».*

Можна праводзіць паралелі і з польскай «Салідарнасцю», і з так і не стварыўшымся студэнцкім прафсаюзам «Салідарнасць» (дагэтуль невядома, з-за чаго пасварыліся ягоныя ініцыятары, так і не зрабіўшы агульнарэспубліканскі студэнцкі прафсаюз). Стваральнікі новай маладзёжнай арганізацыі на гэткія гучныя паралелі не прэтэндуюць. Пакуль яны чакаюць адказу з Мінюсту.

Увогуле, падобна на тое, што на Беларусі надыходзіць час амаль прафесійных маладых палітыкаў. Цімох Дранчук МС таксама заяўляе, што ў баку не будзе: *«Размова па-беларуску на вуліцы ў нас — ужо палітыка. Ніякая арганізацыя не можа абмінуць палітыку — інакш палітыка зоймецца ёю. А ўлічваючы тое, што моладзь, навучэнцы, студэнты па вызначэнні з'яўляюцца найбольш актыўнай часткай насельніцтва, мы будзем займацца і такой дзейнасцю. Гэта не значыць, што яна ў нас будзе асноўнай, але яна таксама будзе».*

Пра стварэнне сваей арганізацыі — менавіта палітычнай — заяўляў і былы сябра МФ, а зараз дзейсны сябра рады БНФ Аляксей Шыдлоўскі. Арганізацыя МФаўскіх раскольнікаў таксама ў стадыі стварэння. Так што добра забытыя старыя, пэўна, намалююць нам сапраўды новую хвалю беларускай маладзёвай палітыкі. ■

РАЗВАЖАНЬНІ

НАЦЫЯ ЯНЫЧАРАЎ

Заканчэньне. Пачатак на с. 1

рэльефней выстаўляе паталёгію.

Лукашэнка то называе Сапегу таварышам, то блытае сябе з Сапегам. У іншай краіне вынікам гэтага была б клініка й дыягназ, у нас — толькі кпіны нешматлікіх інтэлектуалаў. Большасьць беларусаў (на ўзроўні масавай сьвядомасьці) як і раней уключана ва ўжо неіснуючую імпэрска-савецкую прастору, а праз яе ў ніколі не існаваўшую гісторыю СССР са старажытных часоў да нашых дзён.

АСАБЛІВАСЬЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА МЭНТАЛІТЭТУ

Гадоў 400–500 таму туркі выкрадалі маленькіх славянскіх хлопчыкаў, каб, выхаваўшы іх адмысловым чынам, стварыць корпус янычараў. Янычары нічога ня памяталі пра сваё мінулае, у іх не было бацькоў, гісторыі, матчынай мовы (карысталіся турэцкай). Ім было забаронена валодаць уласнасьцю ды мець сваю сям'ю. Карацей, у іх адбіралі мінулае ды будучыню. Адзінае, што заставалася ў янычараў — султан. Яму яны былі адданыя да сьмерці. Выконваючы ягоныя загады, янычары выразалі цэлыя вёскі сваіх кроўных сваякоў-славянаў.

Менавіта нацыяй янычараў сталі сучасныя беларусы. Гісторыі ніхто як сьлед ня ведае, у будучыню ня верыць. Родную мову даўно замяніў *«язык»*. Настолькі даўно, што зараз ніхто й не задумаецца, нашто нам наш язык, калі няма мовы? Праз *«язык»* (узгадайма хаця б такі распаўсюджаны аргумэнт — *«Что ты, как не русский?»*) мы атаясамліваем сябе зь іншым народам, як славяне-янычары атаясамлівалі сябе з асманамі.

Як янычары, мы плённа працуем на гаспадароў, выразаючы па загаду султана апошнія выспачкі беларускасьці ў Беларусі. Камусьці хочацца, каб мы й надалей заставаліся янычарамі, не адчувалі сваіх каранёў. Таму з 1995 году над намі зноў залунаў *«закат над болотом»*, з 1996 году Днём незалежнасьці стала 3 ліпеня, а з 1998 Дзяды перасталі лічыцца сьвятам. Парадаксальна, але хаця нам і здаецца, што нас пазбаўляюць мінулага, насамрэч гэтымі крокамі нас пакідаюць бяз будучыні. Маюць рацыю тыя, хто кажа, што пакуль мы ня ўзновім сваю повязь зь мінулым, то не адкрыем для сябе й будучыні. Трывалая будучыня павінна стаяць на трывалым падмурку. ■

LUKA TV

ОСТОРОЖНО, ЗЛАЯ СОБАКА

Александр Кавальский

Неожиданно жертвой воскресного «Резонанса» стал Независимый институт социально-экономических и политических исследований, возглавляемый Олегом Манаевым. Подчеркнув незначительность НИСЭПИ, Зимовский, тем не менее, обрушил на него весь свой обличительный задор, обозвав *«социологией на финансовом прикорме»*.

Причину, по которой Зимовский вдруг обнаружил след западных спецслужб в НИСЭПИ, следует искать, вероятно, в том, что социологические опросы, проводимые институтом Олега Манаева, уже несколько месяцев подряд фиксируют падение рейтинга Лукашенко. В самом институте накат на социологов также связывают с началом президентской кампании. НИСЭПИ активно вел мониторинг выборной кампании в Палату представителей, каждый месяц предоставляя информацию прессе как независимой, так и государственной (кстати, данными опросов не брезговал пользоваться и сам Зимовский, если они не противоречили его идеологическим прогонам). Теперь, в преддверии следующей кампании по выборам президента, институт хотят *«упаковать»*, чтобы не путался под ногами и не мешал.

Что же касается подмеченного бдительным оком Зимовского формального сходства структуры НИСЭПИ со Службой ситуационного анализа при ЦРУ, то тут бэтэшный терминатор попал пальцем в небо и очередной раз открыл Америку. Как заметил сотрудник НИСЭПИ Александр Соснов, если взять автомобиль, то во всем мире, будь то Америка либо Азия, он имеет одну и ту же структуру — двигатель, трансмиссия, колеса. То же касается и социологических служб. Поэтому либо Зимовский — дилетант, либо притягивает за уши все, что под руку подвернется. Скорее всего — и то, и другое.

После такой артподготовки можно ожидать чего угодно. Дело аграриев уже было (Старовойтов—Леонов), дело журналистов (Шеремет—Завадский) тоже. Следующее, вероятно, — дело социологов? ■

СЛАВЯНСКІ СВЕТ

СЭРЦА ЭЎРОПЫ

Таццяна Папова

28 кастрычніка ёсьць нацыянальным чэскім сьвятам. У гэты дзень у 1918 годзе была абвешчаная самастойная краіна Чэхія. З гэтай нагоды ў Нацыянальным прэс-цэнтры прайшла сустрэча часовага паверанага ў справах Чэхіі ў Беларусі Алеша Фойціка.



У пачатку стагодзьдзя найбольш значнай для краіны асобай стаў Томаш Гарыг Масарык (першы прэзыдэнт Чэхаславакіі). Пасьля былі бальшавізацыя Чэхаславакіі, дыпляматычная ізаляцыя краіны, мюнхенскі дыктат, камуністычны пераварот 1948 году, Праская вясна 1968 году, Хартыя'77, аксамітная рэвалюцыя... У часе ўсіх гэтых падзей чэскае грамадзтва калі ня большасьцю, дык сваёй апазыцыйнай часткай імкнулася да дэмакратыі. Цяпер чэскі народ удзячны за дабрабыт краіны нязьменнаму з 1989 году прэзыдэнту-драматургу Вацлаву Гавэлу.

Чэхі лічаць сваю радзіму сэрцам Эўропы. Краіна спраўды адпавядае гэтаму статусу. Галоўным дасягненьнем за дзясяць год, што мінулі з часоў аксамітнае рэвалюцыі, амбасадар лічыць людзей, якія маюць галаву, рукі й жаданьне працаваць. Студэнты з задавальненьнем едуць вучыцца за межы маленькае Чэхіі, але абсалютная бальшыня вяртаецца на радзіму. Тут яны бачаць для сябе пэрспэктывы. Ім падабаецца іх краіна, яны ганарацца ёй.

Калі нехта зь беларускіх журналістаў спытаўся аб узроўні пісьменнасьці ў гэтай краіне, Алеш Фойцік разгубіўся. Пад гэтым тэрмінам за мяжой даўно разумеюць кампутаровую адукаванасьць. Для чэскіх школьнікаў *Internet* стаўся тым жа, чым для беларускіх тынэйджэраў — плэер. Хто яшчэ ня мае выхаду ва ўсясьветную павуціну дома, уважае валоданьне мадэмам за найвялікшае шчасьце. Наагул жа, прыблізна мільён чэхаў штодня карыстаецца паслугамі нэту.

Чэхія робіць усё магчымае, каб наблізіць сваё ўваходжаньне ў Эўразьвяз. Менавіта таму прадстаўніцтва краіны паважліва ставіцца да ўсіх заяў парлямэнцкае «тройкі», што прыязджала ў Менск. Сваіх назіральнікаў на парлямэнцкія выбары Чэхія не дасылала. Наагул, амбасадару давялося канстатаваць, што беларускія й чэскія погляды на палітычную рэчаіснасьць шмат у чым разыходзяцца. Па меркаваньні Алеша Фойціка, бальшыня непаразуменьняў зьявілася пасьля беларускага рэфэрэндуму 1996 году. Тэрмін апошняе сустрэчы прадстаўнікоў дзьвюх дзяржаў на вышэйшым узроўні ніхто з тае пары згадаць ня можа.

Нягледзячы на амаль роўныя прыродныя ўмовы й тое, што чэскія абшары ўдвая меншыя за беларускія, гэта краіна ўваходзіць у дзесятку буйнейшых экспартэраў у Беларусь. Зь Беларусі ў Чэхію накіроўваюцца збольшага турысты. Іх колькасьць скарацілася пасьля павелічэньня кошту чэскае візы да 60 USD. Па словах Алеша Фойціка, гэтая мэра была адказам на нежаданьне Беларусі паменшыць кошт праходжаньня праз сваю мяжу. Як толькі беларускі бок зьнізіць плату, Чэхія з задавальненьнем зробіць тое самае. Гэта выгадна перадусім нам, бо чэскія турысты не такія частыя госьці на беларускай зямлі. ■

FROM BYELORUSSIA WITH LOVE

ТУРЕЦКИЙ МАРШ

Игорь Воляник

Вот уже двести лет в Турции внедряются западные ценности во все сферы общества. Тем не менее, современная Турция по-прежнему испытывает ряд социально-экономических и этно-конфессиональных проблем, ставших препятствием на пути интеграции ее в Европу. 29 октября Турция отметила свой праздник — День независимости и начала светских реформ.



Старт радикальным преобразованиям в бывшей Османской империи был дан Мустафой Кемалем Ататюрком, который в октябре 1923 года стал первым президентом Турецкой республики. Мустафа Кемаль был убежденным сторонником вестернизации общества и считал, что причина отсталости и поражения Османской империи в первой мировой войне заключалась в приверженности турков прошлому и устаревшим исламским догмам.

Началась жесткая и авторитарная модернизация. В стране был принят гражданский кодекс вместо законов шариата, закрыты медресе, запрещены суфийские ордена, ношение паранджи, ликвидировалось многоженство, принудительно вводилась европейская одежда.

Турция была провозглашена светским государством, одним из основных принципов которого стало отделение религии от государства. Женщины уравнивались в правах с мужчинами. Были введены фамилии, и Мустафа Кемаль в знак признания его заслуг стал Ататюрком (отцом турков). В 1929 году турецкий язык и вовсе поменял арабский шрифт на латиницу, причем Ататюрк усадил за парты изучать новый алфавит практически всю многомиллионную страну — пример, которому можно только позавидовать.

Осуществляя радикальные преобразования в обществе, Турция никогда не скрывала своей прозападной ориентации, хотя с выбором кумиров не всегда было просто. Ее долгое время подозревали в симпатиях к нацистской Германии. Тем не менее, после окончания второй мировой войны Турция стала основным геополитическим союзником США и Западной Европы на Среднем Востоке. С 1947 года в соответствии с планом Маршалла и доктриной Трумэна она стала получать крупные кредиты и безвозмездные ссуды. В 1952 году ее приняли в НАТО, затем последовало членство в МВФ, ГАТТ, а с 1963 года она стала ассоциированным членом ЕС.

Гарантом сохранения в Турции светского государства всегда выступала армия, чтящая идеалы кемализма и успешно совершающая государственные перевороты, как только возникает угроза смены политического курса. Причем подобная практика сохранилась и до сих пор. Периоды правления военных всегда чередовались с приходом гражданских кабинетов к власти, по инициативе самих генералов.

Политические деятели Турции никогда не отказывались от курса на построение демократии, сталкиваясь с множеством препятствий на своем пути. Парадоксальным образом демократизация и либерализация способствовали возрождению и росту традиционных исламских ценностей в обществе, особенно в слаборазвитых восточных и юго-восточных частях страны. Исламистские организации стали набирать вес, несмотря на жесткий прессинг со стороны армии и спецслужб.

Турок, который снял феску, надел пиджак и галстук, не перестал быть турком. Затаенная глубинная негативная реакция на радикальную вестернизацию, ломку традиционных ценностей и сохранение социальной несправедливости рвалась наружу и проявилась в росте исламистских настроений на протяжении 70–90 годов. В начале 90-ых в некоторых крупнейших городах прошли волнения, вызванные запретом студенткам появляться на занятиях в исламской одежде.

Настоящим шоком для многих наблюдателей стал крупный успех впервые за многие десятилетия исламской Партии благоденствия во главе с Н. Эрбаканом на парламентских выборах в декабре 1995 года. Став премьер-министром, Эрбакан выступил с амбициозными планами создания исламского Общего рынка, исламского НАТО и даже исламского ООН. За подобные речи Эрбакан под давлением военных был смещен со своего поста, а его партия запрещена. Турция в очередной раз столкнулась с необходимостью силового сохранения демократии и противостояния исламским фундаменталистам.

Серьезным препятствием для Турции на пути в Европу является также нерешенный еще со времен распада Османской империи «курдский вопрос». Законодательно курды не имеют права не то что на национальную, но и на культурную автономию. Их даже не считают отдельным народом, причисляя к *«горным туркам»*. Руководство Турции предпочитает решать курдскую проблему сугубо военными мерами, регулярно осуществляя карательные операции против повстанцев с использованием авиации и артиллерии. С согласия Саддама Хусейна турецкая армия имеет право преследовать курдов и на территории Северного Ирака.

Борьба с курдами объединяет как ультраправых, так и исламистов. Примером тому служит разразившийся недавно скандал о связях радикальной турецкой группировки «Хезболлах» с армией и правительством, по заказу которых она участвовала в спецоперациях против курдов. Боевики-исламисты совместно с отрядами *«сельских стражей»* убили около 400 курдов в провинции Батман. Успехом турецких спецслужб можно также считать захват лидера Курдской рабочей партии Абдуллы Оджалана, которому смертный приговор заменили пожизненным заключением в неприступной крепости — тюрьме на острове Имралы. Однако, несмотря на подобные репрессии, курды не собираются прекращать свою борьбу, омрачая надежды Турции как можно скорее стать полноправным членом ЕС.


Решенный в свое время «армянский вопрос» чуть не стал причиной ухудшения отношений между США и Турцией. В комитете по международным делам Конгресса США в прошлом месяце прошли слушания по поводу геноцида армян в Османской империи в 1915–23 годах, жертвами которого стали полтора миллиона человек. Был даже разработан проект соответствующей резолюции с осуждением подобной практики. Турция отметает все обвинения в свой адрес и утверждает, что жертвы среди армянского населения были вызваны тяжелыми условиями Первой мировой войны. По иронии судьбы активное участие в истреблении армян принимали курды.

Под давлением администрации США, а также угроз Турции предпринять ответные меры и пересмотреть отношения с США, голосование по данной резолюции было отложено на неопределенное время. ■

ПО СТРАНАМ И КОНТИНЕНТАМ


США. В последние дни перед выборами 43-го американского президента между демократом Гором и республиканцем Бушем-младшим разгорелась битва за Калифорнию. Этот штат представляют 54 выборщика (президента США выбирают не все граждане, а коллегия выборщиков). Их голоса могут существенно повлиять на итоги кампании: согласно соцопросам, пока Гор и Буш идут ноздря в ноздрю, и если так будет продолжаться и дальше, то победу сможет определить только фотофиниш.

Пока же в Калифорнию приехал сенатор Буш, чтобы хоть немного поднять рейтинг республиканцев, который в этом штате не очень высок еще со времен маккартистских обысков в Голливуде. Интересной деталью этой президентской кампании является то, что некоторые телевизионные ролики кандидатов идут на испанском языке. Так коварные гринго пытаются охмурить испаноамериканских избирателей.



КОСОВО. Во временно оккупированной югославской провинции 29 октября прошли муниципальные выборы под эгидой ОБСЕ. В отличие от Беларуси, избирательная активность составила около 80 процентов. Сенсацией стало поражение Демократической партии Косово, возглавляемой Хашимом Тачи, лидером бывшей ОАК. Демпартия контролировала 27 из 30 муниципалитетов автономного края с июля 1999 года, то есть со времени ввода миротворческого контингента.


Теперь от экс-боевиков власть перешла к Демократической лиге Ибрагима Руговы, который даже во время обострения сербско-албанского конфликта отстаивал идею ненасильственной борьбы. Интеллигентный Ругова и теперь выступает за прекращение насилия и за мирную интеграцию сербов в албанское сообщество. Сербы же (их осталось в крае 50–75 тысяч) выборы бойкотировали.



ПОЛЬША. Летом этого года развалилась правительственная коалиция UW (Союза свободы) и AWS, а сейчас и сам избирательный блок «Солидарность» на грани распада. Входящие в него партии SKL, PPChD и ZChN выступили против лидера AWS Марьяна Кшаклевского. Они требуют коллегиального руководства блоком, и чтобы каждой из партий в этом руководстве принадлежало 20 процентов голосов (то есть, чтобы они втроем могли определять политику AWS). Похоже, что Кшаклевский скорее пойдет на распад блока, чем уступит свое место.

ПЕРУ. В 1992 году президент страны Альберто Фухимори разогнал конгресс и начал править, опираясь на армию и издавая декреты. Теперь он пожинает плоды когда-то созданной им модели перуанской демократии. В страну вернулся бывший товарищ Фухимори по диктаторским шалостям Владимиро Монтесинос, у которого до сих пор сильны позиции среди генералитета. Чтобы предотвратить военный переворот, Фухимори уволил сразу четырех генералов, заподозренных в симпатиях к Монтесиносу. Но брожение в армии продолжается. Восставшие солдаты в количестве около 50 человек сначала захватили городок Токепало на юге страны, а потом и военную базу неподалеку. Их требование — отставка Альберто Фухимори. Интересно прокомментировал ситуацию один из лидеров оппозиции Алехандро Толедо. Ему противоборство Фухимори и Монтесиноса напоминает драку сиамских близнецов.

ИСПАНИЯ. Очередной жертвой баскских сепаратистов стал судья Верховного суда Испании, подорванный в своем автомобиле. Число жертв бомбистов из ЭТА с начала года перевалило за второй десяток. Если так пойдет и дальше, то в испанских органах власти скоро согласятся работать лишь потенциальные самоубийцы.



ОТ ПЕРВОГО ЛИЦА

ЧЕРНЫЕ ТЕХНОЛОГИИ

Мечислав Гриб



Впервые за последние 25 лет я не участвовал в борьбе за депутатский мандат. Вместе с общественными объединениями я организовал независимое внутреннее наблюдение за исполнением избирательного законодательства. И хотя, по моему глубокому убеждению, это законодательство не является демократическим и не отвечает международным стандартам, мы вели наблюдение за выполнением именно этого законодательства, потому что у нас не было выбора.

Белорусские власти, принимая Избирательный кодекс в 2000 году, заложили в этот закон ряд нормативных положений, позволивших односторонне сформировать избирательные комиссии, подконтрольные органам власти, массово отказать в регистрации независимым кандидатам в депутаты, а в последствии и сфальсифицировать выборы. Для этого использовалась система досрочного голосования, голосования по месту жительства граждан, манипуляции с избирательными списками, нечеткие, иногда двусмысленные, формулировки отдельных положений избирательного законодательства. Эти и другие возможности широко использовались представителями власти как в центре, так и на местах, которые в нарушение Избирательного кодекса повсеместно руководили работой избирательных комиссий, осуществляя выполнение плана-задания по выборам кандидатов от партии власти.

Главной целью первого тура выборов было обеспечение 50-процентной явки избирателей на избирательные участки. Для ее достижения власти использовали свой административный ресурс.

